# Краязнаўчая газета

№ 5 (358)
Студзень 2011 года

Выдаецца з красавіка 2003 года

www.bfk.by


## У нумары:


Афіцыйнае: першае пасяджэнне новага Савета – стар. 2

З нябыту: фоталетапіс П. Валынцэвіча – стар. 4

Турыстам адрасы: дзе жылі Буш, Каруза і барон – стар. 5




## На тым тыдні...

**З 13 па 22 студзеня** ў мінскай Гарадской галерэі Л. Шчамялёва прайшоў дэбютны **музычна-мастацкі праект паэткі, бардэсы і мастачкі Таццяны Беланогай** (пра яе мы пісалі ў сваёй газеце) «Сістэма каардынатаў». У яго рамках 22 студзеня адбыўся канцэрт-прэзентацыя песень Таццяны.

Да юбілею Івана Шамякіна бібліятэкі арганізавалі шэраг мерапрыемстваў, прысвечаных народнаму пісьменніку Беларусі, вядомаму грамадскаму дзеячу, акадэміку Нацыянальнай акадэміі навук Беларусі.

**З 24 студзеня** ў Цэнтральнай навуковай бібліятэцы імя Якуба Коласа НАН Беларусі арганізаваная **выстаўка, прысвечаная класіку нашай літаратуры**, на якой прадстаўленыя зборы твораў розных гадоў выдання, яго асобныя творы, выданні пра жыццёвы і творчы шлях пісьменніка. Прадстаўлены новы выпуск серыі біяграфічных кніг «Жыццё знакамітых людзей Беларусі» – выданне «Іван Шамякін. Летапісец эпохі: успаміны, інтэрв'ю, эсэ», у якое ўвайшлі ўспаміны літаратараў, сяброў і сваякоў І. Шамякіна.

Выстаўкі, прысвечаныя таленту І.П. Шамякіна, адбыліся таксама ў Гомельскай, Магілёўскай і Брэсцкай абласных бібліятэках, у бібліятэках многіх іншых гарадоў краіны.

У Нацыянальнай бібліятэцы Беларусі **25 студзеня** прайшлі прэзентацыя кнігі **«Іван Шамякін. Летапісец эпохі: успаміны, інтэрв'ю, эсэ» і адкрыццё кніжнай выстаўкі «Летапісец эпохі»**. На кніжнай выстаўцы экспануецца каля 200 выданняў, асобныя творы, за якія пісьменнік атрымаў шэраг узнагародаў, біяграфічныя і літаратуразнаўчыя публікацыі даследчыкаў яго творчасці. У мерапрыемстве ўзялі ўдзел дырэктар НББ Р. Матульскі, галоўны рэдактар выдавецтва «Мастацкая літаратура» В. Шніп, галоўны рэдактар часопіса «Маладосць» Раіса Баравікова, кандыдат філалагічных навук, супрацоўнік Інстытута мовы і літаратуры НАН Беларусі Алеся Шамякіна; доктар філалагічных навук, член Саюза пісьменнікаў Беларусі Таццяна Шамякіна ды іншыя.

**27 студзеня** ў сталічнай Галерэі сучаснага мастацтва «Ў» прайшла **прэзентацыя новай кнігі філосафа Уладзіміра Мацкевіча «Пераацэнка каштоўнасцяў у культуры і гісторыі Беларусі»**, якая працягвае серыю «Беларусь для пачаткоўцаў». Аўтар кнігі запрашае чытача да дыскусіі па спрэчных і балючых пытаннях культурна-гістарычнага самавызначэння нацыі.

**27 студзеня** ў Нацыянальнай бібліятэцы Беларусі прайшла літаратурна-творчая сустрэча ў рамках адкрыцця кніжна-ілюстрацыйнай выстаўкі **«Вялікі талент, вялікая работа, вялікае сэрца»**, прысвечанай лаўрэатам прэміі «За духоўнае адраджэнне» і спецыяльнай прэміі Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь дзеячам культуры і мастацтва 2010 года. (Падрабязней пра гэта чытайце ў наступным нумары.)

# Юбілей святкавалі ўсёй вёскай

***З самай раніцы 20 студзеня ў жыхароў вёскі Новая Карма Папаратнянскага сельсавета Жлобінскага раёна быў незвычайны настрой. У гэты дзень да іх павінны завітаць госці – кіраўніцтва сельскага выканкама, мясцовай гаспадаркі, сельгаспрадпрыемства «Папаратнае», самадзейныя артысты і школьнікі з Папаратнага, а таксама карэспандэнты раённай газеты. Віноўнікам гэтага збору стаў ветэран Вялікай Айчыннай вайны і працы Сцяпан Захаравіч Ісаенка. Яму споўнілася 90 гадоў!***

Сцяпан Захаравіч нарадзіўся не ў гэтай вёсцы, а каля Кароткавічаў былога Стрэшынскага раёна. Тым не менш у Новай Карме ён пражыў 65 гадоў, з 1946 года, пасля дэмабілізацыі. Тут былы франтавік ажаніўся, пабудаваў дом, у гэтай вёсцы нарадзіліся яго дзеці. На жаль, некалі шматлюдная вёска, дзе адных паляводчых брыгадаў было дзве па сто чалавек кожная, сёння трапіла ў лік маланаселеных – без свайго магазіна, клуба, паштовага аддзялення і школы. Свой век тут дажываюць нямногім больш за дваццаць чалавек, большасць з якіх, хаця і маладзей за юбіляра, але адносіць сябе да яго пакалення. Многія, каму дазволіў стан здароўя, прыйшлі ў хату да Сцяпана Захаравіча, каб павіншаваць яго з днём нараджэння ды на гасцей паглядзець (для аддаленай вёскі адно гэта – падзея).

Але больш за ўсіх радаваўся шматгалоссю ў сваёй хаце яе гаспадар. Больш за дваццаць гадоў ён жыве адзін – дзеці раз'ехаліся, жонка памерла. Яму было прыемна паціснуць руку дырэктару гаспадаркі «Папаратнае» Юрыю Анасовічу, які ад імя дырэкцыі і прафкама ўручыў юбіляру падарунак і грашовую прэмію, а таксама пажадаў моцнага здароўя. Кіраўнік сельгаспрадпрыемства нагадаў, што Сцяпан Захаравіч не адно дзесяцігоддзе адпрацаваў у «Папаратным» (раней – калгас «Іскра») трактарыстам, быў узнагароджаны медалямі «За доблесную працу», «Ветэран працы».

Нямала цёплых словаў у адрас юбіляра сказаў і старшыня сельскага выканкама Віталій Сушко. Ён таксама ўручыў падарунак і грашовую прэмію і расказаў, што Сцяпан Захаравіч Ісаенка – адзін з самых паважаных жыхароў сельсавета. Ён прайшоў усю Вялікую Айчынну вайну з першага і да апошняга дня, абараняў Маскву, у баях за вызваленне Прыбалтыкі быў паранены. Перамогу «артылерыст зенітнай артылерыі малога калібра» радавы С.З. Ісаенка сустрэў ва Усходняй Прусіі. За праяўленую мужнасць у барацьбе з ворагам, узнагароджаны ордэнам Айчыннай вайны I ступені, медалямі «За баявыя заслугі», «За перамогу над Германіей».

А калі Сцяпана Захаравіча пачалі віншаваць школьнікі, ён не стрымаў слёзы – вучні Папаратнянскай школы частыя ў яго госці, бо не адзін ужо год трымаюць над ветэранам шэфства. Ад усёй душы спявалі для юбіляра і жыхароў вёскі ўдзельнікі вакальнага ансамбля народнай песні «Палессе» Папаратнянскага сельскага Дома культуры.

...Доўга не хацеў гаспадар адпускаць сваіх гасцей, шчыра дзякаваў за падарункі і за ўзняты настрой. Удзячнымі за гэтае свята засталіся і ўсе жыхары вёскі Новая Карма.

*Мікалай ШУКАНАЎ,*
*супрацоўнік жлобінскай райгазеты «Новы дзень», краязнаўца*

*На здымку Мікалая СЕМЯНЦА: падарункі ад сельскага выканкама, ансамбля «Палессе» і школьнікаў*

# Першае пасяджэнне
## Рэспубліканскага грамадскага савета па справах культуры і мастацтва пры Савеце Міністраў Рэспублікі Беларусь

***26 студзеня 2011 года ў Мірскім замку адбылося першае пасяджэнне Рэспубліканскага грамадскага савета па справах культуры і мастацтва пры Савеце Міністраў Рэспублікі Беларусь. Вёў пасяджэнне старшыня Савета, міністр культуры П.П. Латушка, у яго рабоце прымаў удзел намеснік старшыні Савета Міністраў Рэспублікі Беларусь А.А. Тозік.***

Савет разгледзеў і зацвердзіў план работы на 2011 год, перспектыўны план, склад пастаяннай рабочай групы і рабочых групаў Рэспубліканскага Савета па накірунках культуры і мастацтва.

Сярод прыярытэтных накірункаў грамадскай дзейнасці члены Савета вызначылі наступныя:

– культура: выхаванне праз усё жыццё;

– ахова аб’ектаў гісторыка-культурнай спадчыны;

– роля грамадскіх арганізацыяў у развіцці культуры і мастацтва;

– развіццё нацыянальнага мастацтва ў сучасным кантэксце;

– развіццё культуры рэгіёнаў;

– прадстаўленне культуры Беларусі за мяжой;

– падтрымка творчай моладзі;

– развіццё кінамастацтва.

Першыя два пытанні будуць разгледжаныя на Савеце 6 красавіка і 5 кастрычніка 2011 года.

Пры абмеркаванні ўзнятых на пасяджэнні пытанняў і праекта рашэння Савета выступілі рэктар Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта культуры і мастацтваў Б.У. Святлоў, старшыня грамадскага аб’яднання «Беларускі саюз тэатральных дзеячаў» А.А. Дудараў, дырэктар Магілёўскага абласнога метадычнага цэнтра народнай творчасці і культуры А.Ф. Хмялькоў, старшыня Грамадскай назіральнай камісіі Мінкультуры Рэспублікі Беларусь па захаванні гісторыка-культурнай спадчыны А.І. Бутэвіч, вядомы гісторык, старшыня грамадскай камісіі «Вяртанне» Беларускага фонду культуры, прафесар А.І. Мальдзіс, старшыня грамадскага аб’яднання «Беларускае добраахвотнае таварыства аховы помнікаў гісторыі і культуры» А.У. Астаповіч, старшыня грамадскага аб’яднання «Таварыства беларускай мовы» А.А. Трусаў, загадчык арганізацыйна-творчага аддзела Любанскага раённага Цэнтра культуры і вольнага часу С.Г. Выскварка, дырэктар Нацыянальнай бібліятэкі Беларусі Р.С. Матульскі, старшыня грамадскага аб’яднання «Беларуская гільдыя акцёраў кіно» С.І. Сухавей, дырэктар Інстытута мастацтвазнаўства, этнаграфіі і фальклору НАН Беларусі А.І. Лакотка, старшыня грамадскага аб’яднання «Беларускі фонд культуры» У.А. Гілеп.



Абраны склад пастаяннай рабочай групы грамадскага савета. У яе ўвайшлі А.І. Бутэвіч (старшыня), М.М. Пінігін – мастацкі кіраўнік тэатра імя Янкі Купалы, У.П. Савіч – старшыня ГА «Беларускі саюз мастакоў», М.Я. Фінберг – дырэктар і мастацкі кіраўнік Нацыянальнага акадэмічнага аркестра сімфанічнай і эстраднай музыкі Рэспублікі Беларусь, С.В. Гуткоўская – загадчык кафедры харэаграфіі Беларускага ўніверсітэта культуры і мастацтваў, Л.І. Перагудава – галоўны рэдактар часопіса «На экранах», У.І. Пракапцоў – генеральны дырэктар Нацыянальнага мастацкага музея Рэспублікі Беларусь, Б.У. Святлоў – рэктар Беларускага ўніверсітэта культуры і мастацтваў.

***Наш кар.***

### *Нашы віншаванні*

***Рэдкалегія «Краязнаўчай газеты» шчыра віншуе калектыў і ўсіх чытачоў газеты «Наша слова» – органа грамадскага аб’яднання «Таварыства беларускай мовы» – з юбілейным 1000-м нумарам.***

***Жадаем і далей трымацца, змагацца і перамагаць у няпростай барацьбе за родную мову. У гэтай нялёгкай справе будзем разам!***

***Галоўны рэдактар «Краязнаўчай газеты»***

# У 2011-м спаўняецца

**145 гадоў** таму нарадзіўся **Снітка Андрэй Канстанцінавіч** (1866–1920), беларускі этнограф, краязнавец, музеязнавец.

**115 гадоў** таму нарадзілася **Кіш Алена Андрэеўна** (1896–1949), беларускі майстар дэкаратыўна-ўжытковага мастацтва.

**110 гадоў** таму нарадзілася **Вержбаловіч** (Вербіч) **Барбара Іванаўна** (1901–1967), беларуская спявачка. З 1944 г. жыла за мяжой.

**105 гадоў** таму (1906) быў створаны **Віцебскі музычна-драматычны гурток**. Існаваў да 1914 г.

**105 гадоў** таму нарадзіўся **Галубок Эдуард Уладзіслававіч** (1906–1943), беларускі фалькларыст, літаратуразнавец і крытык.

**105 гадоў** таму нарадзіўся **Гарох Янка** (1906 – 1909?), паэт, удзельнік нацыянальна-вызваленчага руху ў Заходняй Беларусі.

**105 гадоў** таму (1906) была заснаваная **друкарня Марціна Кухты** ў Вільні. Існавала да 1916–1917 гг.

**95 гадоў** таму (1916) была заснаваная **«Беларуская хатка»**, клуб беларускай мастацкай інтэлігенцыі. Існавала да 1922 г.

**95 гадоў** таму (1916) быў створаны **Беларускі клуб у Вільні** пад старшынствам І. Луцкевіча. Існаваў да 1920 г.

**95 гадоў** таму (1916) быў заснаваны тэатральны калектыў **«Беларуская драматычная дружына»** пры Беларускім клубе ў Вільні. Існаваў да 1918 г.

**90 гадоў** таму (1921) было створанае **таварыства беларускай нацыянальнай меншасці ў Латвіі «Бацькаўшчына»**. Існавала да 1925 г.

**90 гадоў** таму (1921) пачалі выходзіць з друку **«Беларускія ведамасці»**, штотыднёвая грамадска-палітычная літаратурная газета на беларускай мове. Выдавалася да 15 студзеня 1922 г. у Вільні.

**90 гадоў** з часу заснавання (1921) **Беларускага музея імя І. Луцкевіча** ў Вільні, адной з галоўных навуковых і асветніцкіх установаў у гісторыі Беларусі. Існаваў да 1946 г. Большасць збораў цяпер захоўваецца ў найбуйных музеях Літвы і Беларусі.

**90 гадоў** таму (1921) была заснаваная **Нацыянальная бібліятэка Беларусі**.

**90 гадоў** таму (1921) было створанае **Таварыства беларускай школы** (ТБШ), культурна-асветная арганізацыя працоўных Заходняй Беларусі. Існавала да 1936 г.

# Шчодрыкі ў Старым Сяле

Што ні кажыце, а шчодрыкі – цікавы калядны абрад. Вясёлы, жартаўлівы, адметны. У гэты час, хоць на нейкі момант, амаль кожны чалавек нібы трапляе ў казачную краіну, дзе існуюць толькі цуд, дабрыня і весялосць. І як добра, што традыцыі калядавання актуальныя і сёння, што яны не забыліся, не зніклі! Як вядома, прыйшоў гэта абрад да нас з сівой старажытнасці, дзе моцна пераплятаюцца, нібы тыя карэнні старога дрэва, хрысціянскія і язычніцкія традыцыі. Гэтае свята захавалася яшчэ ў нашых вёсках, дзе можна пабачыць пераапранутых у казу, каня, мядзведзя, цыганоў...

Вось і мне нядаўна пашчасціла пабачыць на Веткаўшчыне незвычайны калядны абрад – «Шчадроўка». Яго выдатна выканаў народны фальклорны ансамбль «Рэчанька» з старасельскага клуба. З традыцыйнымі песнямі ды жартамі калядоўшчыкі з «зоркай» хадзілі па хатах сваёй вёскі – услаўлялі Ісуса Хрыста, весялілі гаспадароў, якія, у сваю чаргу, не скупіліся на розныя прысмакі і пачастункі. Бо ў гэты шчодры вечар нельга быць скупымі! Заўсёды лічылася: калі калядоўшчыкі зазірнулі ў хату, то гэта вельмі добры знак. Значыць, будзе лад, згода і добры ўраджай!

***Ганна АТРОШЧАНКА, Веткаўскі раён***



***На фота аўтара: народны фальклорны калектыў «Рэчанька» і яго кіраўнік Антаніна Болбасава; калядоўшыкі-шчадроўшчыкі***



*Выстаўка*

# Ад зямлі слуцкай – да неба



*«Ад зямлі да неба» (фрагмент)*

У сталічным Доме дружбы працуе выстаўка твораў слуцкай мастачкі Алены Хатэнкі «Пад Каляднай зоркай». На ёй прадстаўленыя жывапіс і дэкаратыўна-ужытковае мастацтва маладога майстра. Свае працы яна часта выконвае ў змешанай тэхніцы, сумяшчае ў адным творы ткацтва, кераміку, вышыўку, скуру. Тэма роднай зямлі і чалавечага жыцця раскрываецца ў незвычайных вобразах, што ўзніклі на аснове беларускіх народных традыцыяў і сучаснай культуры.

А пачатак года для нас здаўна праходзіць пад Каляднай зоркай, пад знакам Нараджэння Хрыстова. Гэта час радасці, падарункаў і дароў, і найбольшыя з іх – Любоў і Талент.

За час экспанавання выстаўкі А. Хатэнкі ў Доме дружбы яе творы ўбачаць прадстаўнікі розных краінаў – Кітая, Індыі, Літвы, Латвіі, Азербайджана. Першай акцыяй у зале, дзе працуе выстаўка, стала прэзентацыя першага сёлетняга нумара часопіса «Вясёлка», прысвечанага Кітаю.



*Алена Хатэнка*

У Доме дружбы Алену вітаў прадстаўнік Саюза мастакоў Беларусі Віктар Барабанцаў. Свае вершы і песні пад гітару мастачцы са Слуцка прысвяцілі паэт Канстанцін Цыбульскі і кампазітар Яўген Хаменка. Для сваёй маці заспявала дачка А. Хатэнкі Юлія, удзельніца юнацкай рок-групы.

Амаль адначасова – розніца тры дні – у Дзяржаўным музеі гісторыі беларускай літаратуры была адкрытая другая выстаўка твораў А. Хатэнкі «Вандроўка: зіма – лета». Яе назва адлюстроўвае творчыя імкненні маладой мастачкі, яе актыўныя пошукі ў розных відах і жанрах выяўленчага мастацтва. Непаўторныя яе дэкаратыўныя працы «Ад зямлі да неба», «Рыба-рыбак», «Што там?». Тонкай жывапіснай гамай адметныя пейзажы «Заазер'е», «Люты ў дзіцячым садку», «Сліва» ды іншыя.

Там на адкрыцці выстаўкі мастачку віншавалі вядомыя дзеячы культуры, многія з якіх родам са Случчыны: старшыня ГА «Беларускі фонд культуры» Уладзімір Гілеп, старшыня абласнога аб'яднання пісьменнікаў Рыгор Сакалоўскі, мастакі Уладзімір Басалыга, Віктар Барабанцаў, заслужаны дзеяч мастацтваў Беларусі Уладзімір Кожух. Свае пажаданні выказалі таксама філолаг, пісьменнік і журналіст, прафесар Таццяна Дасаева, вядомы літаратуразнаўца і публіцыст Алесь Марціновіч. Свае вершы прачыталі слуцкія паэткі Галіна Каржанеўская і Ганна Міклашэвіч.



*«Навошта ж так?»*

Абедзьве выстаўкі мастачкі праходзяць пры падтрымцы аддзела культуры Слуцкага райвыканкама. У «групе падтрымкі» – народны фальклорны ансамбль «Ячаўскія вячоркі» са Случчыны. Куратар дзвюх выставак – мастацтвазнаўца і журналіст Ларыса Салодкіна.

Адкрыццё выставак Алены Хатэнкі стала часткай акцыі, на якой усслаўлялася цудоўная культурная спадчына Случчыны.

Шчаслівага табе шляху, Алена!

*Ларыса САЛОДКІНА, фота аўтара*

---

*З досведу працы*

# Адродзіцца замак над Нёманам

***Ёсць нямала людзей, якія ўмеюць і могуць цаніць дзіўную прыгажосць і практычную значнасць даўніны, увасобленай у помніках архітэктуры, якія пакінулі на сваёй зямлі нашыя продкі.***

Яшчэ ў савецкія часы адзін з ураджэнцаў Любчы Навагрудскага раёна Мікалай Скабец (на той час – дырэктар завода «Лідсельмаш») выканаў пошукава-праектныя працы з мэтай стварыць тут, на беразе Нёмана, зону адпачынку. Вось гэтую карысную справу і вырашыў працягнуць яшчэ адзін ураджэнец гэтага мястэчка сябра Беларускага фонду культуры Іван Антонавіч Пячынскі, дарэчы, палкоўнік у адстаўцы.

Амаль 10 гадоў працягваюцца працы па рэстаўрацыі Любчанскага замка. З цягам часу да гэтай справы далучыліся і студэнты Беларускага нацыянальнага тэхнічнага ўніверсітэта. Для вырашэння шматлікіх праблемных пытанняў пры вялікім аб'ёме працы патрабуецца нямала энергіі ды і практычных ведаў у будаўніцтве, рэстаўрацыі, архітэктуры. І на будматэрыялы, спецтэхніку і многае іншае ў першую чаргу патрабуецца дамоўленасць, досвед адпаведнай працы. Вялікую ўвагу гэтай складанай справе надае і мясцовая ўлада. Напрыклад, была створаная і актыўна працуе ініцыятыўная група, у склад якой увайшлі адказныя гаспадарчыя работнікі мястэчка і нават раёна. Але, акрамя ўсяго, патрэбныя яшчэ і грошы. Уласных зберажэнняў і разавай дапамогі фундатараў, вядома, недастаткова для такога маштабнага праекта. Таму былі заснаваны спецыяльны фонд «Любчанскі замак», а ў інтэрнэце размешчаны сайт на чатырох мовах, адной з мэтаў якога было знайсці нашчадкаў князёў Радзівілаў, якія некалі валодалі Любчай.



*Інтэр'ер замкавай вежы*

Тут паспяхова наладжваецца і мясцовы турызм, ініцыятарам якога з'яўляецца былы дырэктар мясцовай СШ М. Карповіч. Цяпер ён узначальвае школьны гісторыка-краязнаўчы музей. Прынцып гэтых двух землякоў стаў – «хоць невялічкую працу, але выконваць якасна і кожны дзень».

Шмат дапамагае і брат Івана Антонавіча – Генадзь, ляснічы мясцовага лясніцтва. Многія факты я даведаўся ад яго.

Усе працы па рэканструкцыі замка ў асноўным праводзяцца ўлетку, у часы водпускаў і студэнцкіх канікулаў. На рэстаўрацыі пабывала многа студэнцкіх валанцёрскіх групаў. Напрыклад, мінулым летам у рэстаўрацыйных працах прынялі ўдзел студэнты архітэктурнага факультэта БНТУ, іншых беларускіх ВНУ, працоўная моладзь, а таксама валанцёры з Польшчы, Чэхіі, Вялікабрытаніі.

У планах І. Пячынскага – стварыць на тэрыторыі аднаўленага замка музей, які адлюстроўвае падзеі з гісторыі ВКЛ. Цяпер ідзе збор музейных прадметаў, ствараецца экспазіцыя. Некаторыя для будучага музея падаравала і Альжбета Радзівіл, дачка апошняга нясвіжскага ардынатара, якая летась гасцявала ў замку. Яна вельмі захапілася якасцю ўжо зробленага па адраджэнні замка і прыпаднесла некаторыя копіі партрэтаў Радзівілаў, а таксама копію генеалагічнага дрэва роду.

Да завяршэння праекта яшчэ хопіць працы ўсім ахвочым. Шмат зроблена, але яшчэ і шмат трэба зрабіць. Але дачакаемся, калі помнік даўніны паўстане ў ва ўсёй сваёй красе і славе.

***Яўген ЛАПЦЕЎ, г. Навагрудак***
***Фота Змітра САВЕЛЬЕВА***

# Яшчэ адзін фоталетапісец

***У Нацыянальным гістарычным музеі прайшла ўнікальная выстава фотаздымкаў першай паловы XX стагоддзя «Павел Валынцэвіч. Фоталетапіс даўжынёй у паў стагоддзе».***



*Партрэт святара і фатографа*

Адметная гісторыя яе стварэння. Калекцыянер фотадакументаў Дзмітрый Сярэбранікаў, які збірае краязнаўчыя фотадакументы, выпадкова знайшоў фотапласцінкі з выявамі невядомага фатографа. Другі калекцыянер, Ігар Сурмачэўскі, які збірае фотавыявы людзей, таксама знайшоў фотапласцінкі з партрэтамі невядомых. Пры вывучэнні дакументаў высветлілася, што гэтыя фота выкананыя адным чалавекам. У 2009 годзе Д. Сярэбранікаў звярнуўся па дапамогу да вядомага мінскага фотамайстра Уладзіміра Суцягіна. Пасля аблічбоўкі фотавыяваў пачалася архіўная праца па выяўленні асобаў на іх і таго, хто фатаграфаваў. Да радасці даследчыкаў былі выяўленыя асоба аўтара, імёны яго бацькоў, жонкі і сына.



*Л. Мікалаеўская-Валынцэвіч з даследчыкамі Л. Акаловічам і А. Валахановічам*



*«Царква ў Узмёнах» (1910 г.)*

Ім апынуўся праваслаўны святар Павел Валынцэвіч. Праз паўгода пошукаў выйшлі на яго ўнучку Людмілу Сяргееўну Мікалаеўскую-Валынцэвіч, якая цяпер жыве ў Мінску. Людміла Сяргееўна пацвердзіла ўжо вядомыя даследчыкам звесткі, значна іх дапоўніла і пазнаёміла з сямейным фотаархівам, які ўключае 15 фотаальбомоў яе дзеда. Так нарадзілася ідэя арганізаваць выставу на аснове гэтага ўнікальнага матэрыялу.

Экспазіцыя складаецца з 85 здымкаў, зробленых У. Суцягіным сучаснымі лічбавымі метадамі з фотапласцінак аўтара, 50 фатаграфій – са старонак фотаальбомаў сямейнага архіва Л. Мікалаеўскай-Валынцэвіч, а таксама з шкляных фотапласцінак з прыватных збораў згаданых калекцыянераў. Самы стары са знойдзеных негатываў фотаархіва Паўла Валынцэвіча датуецца 1900 годам, апошні – 1953-м.

Павел Валынцэвіч – асоба высокаадукаваная, шматгранная і яркая. Акрамя фатаграфіі ён пісаў карціны, захапляўся астраноміяй і прыродазнаўствам, разводзіў пчолы, меў вялікую бібліятэку, якой карысталіся яго знаёмыя і шматлікія вернікі.

Нарадзіўся Павел Валынцэвіч у 1875 годзе ў мястэчку Вялікая Бераставіца Гродзенскай губерні ў шматдзетнай сям'і дыякана мясцовай царквы. У 1897 годзе закончыў Віленскую Духоўную семінарыю і 65 гадоў жыцця аддаў служэнню Богу. Быў псаломшчыкам, настаяцелем цэркваў у вёсцы Касута на Вілейшчыне, 43 гады – Свята-Мікольскай у вёсцы Узмёны Мёрскага раёна. У 1902–1904 гадах служыў школьным інспектарам у горадзе Дзісне.

Знойдзеныя выпадкова фотадакументы з'яўляюцца матэрыяльнымі сведкамі храналогіі жыцця і побыту беларусаў за паўстагоддзе і маюць выключную гістарычную каштоўнасць. Дзякуючы гэтаму П. Валанцэвіча можна паставіць у адзін шраг з ужо вядомымі і больш «раскручанымі» Янам Булгакам, Янам Балзункевічам ды іншымі фоталетапісцамі.



*«Прыехалі!» (1907 г.)*

*Зм. ВОЖЫК, фота аўтара і П. Валынцэвіча*

# «Вечны вандроўнік» у Берліне



***Калі б мне сказалі, што такое можа здарыцца, я не паверыў бы. Але ж – у Берліне ў прыватнай галерэі паспяхова прайшла выстаўка «Вечны вандроўнік Язэп Драздовіч і яговыя сябры».***

Галоўным «завадатарам» праекта стаў беларускі мастак Алесь Родзін, які доўгі час працуе ў Берліне на «Тахелесе» (дом мастака). Некалькі дзён на вялікай выставачнай плошчы дэманстравалася экспазіцыя, у якой разам з А. Родзіным бралі ўдзел Змiцер Юркевіч, аўтар гэтых радкоў і некалькі добраахвотнікаў. Частку матэрыялаў загадзя падрыхтавалі ў Мінску. Былі аддрукаваныя вялікія рэпрадукцыі твораў мастака і выраблены англамоўны буклет «Earth and Space Jazeps Drazdovich». Падрыхтавалі таксама фотакалажы, дзе адлюстраваныя мастакі і навукоўцы, якія звяртаюцца да ўнікальнай спадчыны «вечнага вандроўніка» (Арсень Ліс, Алесь Марачкін, Віктар Маркавец, Мікола Купава, Ада Райчонак, Алег Трусаў і іншыя). Яны былі дапоўненыя рукапіснымі англамоўнымі тэкстамі пра жыццё і творчасць Я. Драздовіча. Адкрывала экспазіцыю копія маляванага дывана Язэпа Нарцызавіча. Акрамя гэтага на чорным фоне сценаў і падлогі былі намаляваныя астралагічныя сімвалы, пракладзены шлях «вечнага вандроўніка» ад роднага засценка Пункі на Дзісеншчыне да Вільні, Мінска, Навагрудка, намаляваны накід «касмічнай тарпеды», паводле той, што ён пакінуў у сваіх запісах.

У кожным кутку экспазіцыі былі размешчаныя цікавыя інсталяцыі: размаляваны драўляны ідал пакладзены на дзіцячыя вагі, незвычайны тэлескоп, за якім манекен з павелічальным шклом углядаецца ў зорнае неба... Беларускі «небазнаўца»ператварыўся ў сучасны мастацкі твор, які бачылі сотні гледачоў з усяго свету.

На адкрыцці выстаўкі аўтар гэтых радкоў на англійскай мове расказаў пра велізарную калекцыю маляваных дываноў, што захоўваецца ў музеі-запаведніку «Заслаўе», адзначыў, што Я. Драздовіч быў першым у свеце мастаком, які ў 1930-я гады маляваў разумнае жыццё ў космасе, на планетах сонечнай сістэмы і стварыў сваю касмалагічную тэорыю паходжання планетаў з парназоркавых сістэмаў.

Літаральна за хвіліны пазнікалі дзясяткі буклетаў, але ж засталіся шчырыя, хвалюючыя словы ўдзячнасці арганізатарам выстаўкі ад шматлікіх гасцей, якія да 2 гадзінаў ночы заходзілі ў выставачную залу, каб падзівіцца на скарбы «вечнага вандроўніка» з Беларусі.

Дарэчы, пра гэтую выстаўку даведаліся і ў Беларусі: у мінскай сядзібе ТБМ адбылася мая лекцыя «Невядомыя лісты Я. Драздовіча», дзе акрамя яго спадчыны гучалі і аповеды пра берлінскую экспазіцыю. Магчыма, патрэбен час, каб асэнсаваць падзею, што сапраўды выходзіць за межы звычайнай выстаўкі, бо набліжае беларускае мастацтва да жыхароў Германіі, Італіі, Англіі, Галандыі, Польшчы, Расіі. Але ўжо цяпер можна пэўна сцвярджаць, што ў Берлін, адзін з цэнтраў еўрапейскага мастацтва, упэўнена і годна завітаў наш славуты зямляк і творца. Думаецца, падобныя сумесныя мерапрыемствы маглі б праводзіцца часцей – для гэтага патрэбная супраца айчынных дзяржаўных і прыватных музеяў з замежнымі калегамі. А тое, што нашая культура (сучасная і тая, што стала класікаю, спадчынаю) цікавая ў розных кутках свету, якраз і пацвярджаюць падобныя імпрэзы.

***Юрась МАЛАШ, старшы навуковы супрацоўнік музея-запаведніка «Заслаўе»***



*Рэгіянальны турызм*

# Дзе жылі Каруза, пані Буш і барон Мюнхгаўзен?

Напісаць свае развагі мяне падштурхнулі дзве памятныя даты. 21 лютага штогод па ініцыятыве ЮНЕСКА ў свеце адзначаецца Міжнародны дзень роднай мовы. А ў першую нядзелю верасня беларусы звычайна адзначаюць свята духоўнасці нацыі – Дзень беларускага пісьменства, цэнтрам якога становіцца пэўны горад краіны. Ужо вядома, што налета гасцей будзе сустракаць Глыбокае. Акурат на той зямлі я ў 1953 годзе першым выпускам закончыў Залескую сярэднюю школу. З маленства вывучаю гісторыю кожнай тамтэйшай вёсачкі, цікаўлюся лёсамі людзей, а таксама імкнуся падзяліцца ведамі з сябрамі, часта запрашаю іх у вандроўкі ў тыя мясціны. Больш за дзесяць гадоў тых вандровак змусіла маіх сяброў палюбіць маю Глыбоччыну, пры сустрэчах – цікавіцца, што новага там.

Калі «Краязнаўчая газета» зацікавіцца, а стан здароўя дазволіць, то хацеў бы прапанаваць шэраг артыкулаў, прысвечаных Глыбоччыне і прымеркаваных да будучага Дня беларускага пісьменства. Досвед падобных мерапрыемстваў паказвае, што мясцовыя жыхары і ўлады імкнуцца паказаць свой горад як найлепей, абнаўляюць яго. Не абыходзілася і без руйнавання старых будынкаў, часам – помнікаў архітэктуры не толькі мясцовага значэння. Паколькі сённяшні допіс лічу ўступным да цыкла, то і хачу паразважаць пра тую спадчыну даўніны, што засталася ў горадзе, узгадаць асобаў, якія тут жылі.

У Варшаве ў адной з бібліятэк захоўваецца цікавая паштоўка. Хутчэй за ўсё, адна з паштовак Уладзіміра Уладзімірава, які ў 1930-я гады пачаў іх выданне. Дарэчы, ягоны сын Яўген Уладзіміравіч жыве ў Мінску і ў свае 80 гадоў запатрабаваны і сёння як член-карэспандэнт Міжнароднай акадэміі інфармацыйных тэхналогіяў. Дык вось на той картцы ў энцыклапедычным стылі напісана: «У 1628 г. Язэп Корсак, ваявода Мсціслаўскі, стараста Дзісенскі пабудаваў драўляны касцёл. 20.09.1640 г. – цагляны касцёл і кляштар кармелітаў. 3.12.1642 г. фундаваў 21 валоку зямлі залескай царкве».

Варта зазначыць тут, што фундуш ён даў у 1638 годзе; храм ніколі не закрываўся; у ім ахрышчаныя сем пакаленняў Комеляў.

Далей па паштоўцы ідзе пералік падзеяў Глыбокага да 1863 года, калі кляштар і капліца на могілках «Копцеўка» перайшлі праваслаўнай царкве.

У XV стагоддзі Глыбокае развівалася падобна, як Германія пасля 1945 года, калі спаборнічалі ФРГ і ГДР. Так імкнуліся збудаваць штосьці адметнае Корсакі і Зяновічы – першы ў Полацкім ваяводстве, другі ў Ашмянскім павеце.

Ёсць версія, што прозвішча Корсак паходзіць ад назвы лісы. Мабыць, яе хітрасць дазволіла стаць адным з найбуйных уладальнікаў у Беларусі? І хоць большасць з іх былі праваслаўныя, але будавалі цэрквы і касцёлы, сінагогі і мячэці, з Заходняй Еўропы запрашалі на жыхарства і дзеля працы знакамітых людзей.

Зяновічы паходзяць з Сербіі, ад Ягайлы атрымалі ў XIV стагоддзі землі ад Прыпяці да Дзвіны. Вядома, род не мог дазволіць, каб бляск іх багаццяў быў цямнейшы за бляск уладанняў Корсакаў. Так і ўтварыўся ўнікальны куточак – Глыбоччына.

Калі ехаць з боку Мінска, то за 8 кіламетраў да Глыбокага ёсць вёска Сарокі, якой валодаў род Рудамінаў (герб «Трубы»). На мясцовых могілках пахавана пані Буш. На магіле – крыж старадаўняга чыгуннага ліцця з надпісам. Непадалёк ад вёскі жыў Павел Іосіфавіч Каруза (мы ведаем гэты род па знакамітым італьянскім оперным тэнары). За 4 кіламетры на захад ад Сарок у вёсцы Дзеркаўшчына – маёнтак нацыянальнага героя Чылі Ігнація Дамейкі. Руплівец па адраджэнні старажытнай мовы іўрыт Перэльман нарадзіўся ў мястэчку Лужкі, а ў Глыбокім вучыўся. Невядома, хто і як заманіў у Глыбокае... барона Мюнхгаўзена. Ды абсалютна дакладна вядома, што на могілках «Копцеўка» (непадалёк ад калоны ў гонар Канстытуцыі Рэчы Паспалітай) ёсць старадаўні літы чыгунны крыж з датай пахавання барона Мюнхгаўзена. Гэта далёка не поўны пералік вядомых і невядомых (але пасвойму цікавых) ураджэнцаў і жыхароў краю. Пра некаторых і хачу пазней больш падрабязна расказаць на старонках «Краязнаўчай».

Сучаснае Глыбокае ўтварылася з пяці розных частак. Самае старое паселішча – Слабада Глыбоцкая, што на поўдзень ад возера Кагальнае. Ад XI стагоддзя Слабадой называлі населены пункт, жыхары якога альбо былі вызваленыя ад некаторых павіннасцяў, або не былі прыгоннымі. Амаль на тэрыторыі таго паселішча ў гады майго дзяцінства стаялі дзве сярэднія школы: руская з чырвонай цэглы і беларуская, пафарбаваная ў белы колер. Свае назвы атрымалі ад мовы выкладання прадметаў у іх. Нумар першы атрымала белая, захавала яго і дасёння. Але мала хто ведае, што яе і сапраўды пабудавалі «белыя». У 1930 годзе ў Польшчы праходзілі выбары ў Сейм. Каб заручыцца падтрымкаю выбарнікаў, у горад прыехаў наш зямляк маршал Юзаф Пілсудскі, род якога нейкі час валодаў вёскай Мосар (а ягоная сястра жыла тут да 1946 года). Госць прысутнічаў на службах у касцёле і ў царкве. Грошы, сабраныя на ягоную сустрэчу, загадаў выдаткаваць на пабудову школы, якая і з'явілася ў 1932 годзе, а ў 1936-м тут працаваў Язэп Драздовіч.



*«Чырвоная» школа на старой паштоўцы*


*Аўтар артыкула праводзіць чарговую экскурсію па Глыбокім, каля возера Кагальнае*

*Фота Алы НЕВЯРОВІЧ*

У пратаколе № 10 пасяджэння Глыбоцкага гарвыканкама ад 04.12.1944 года дырэктар школы Згірскі адзначаў, што пад час нямецкай акупацыі ў яе памяшканні знаходзіўся шпіталь, а ўсё абсталяванне было знішчанае. На канец 1944-га тут навучалася 500 дзяцей, працавалі 17 добра падрыхтаваных настаўнікаў, існавалі 5 гурткоў (харавы, балетны, музычны, драматычны, палітычны), ваенная падрыхтоўка, паведамлялася, вялася паводле плана.

Раённая газета «Веснік Глыбоччыны» 23 кастрычніка 2010 года паведаміла пра 25-годдзе заснавання музея авіяканструктара Паўла Сухога. Яго стваральніца Тэрэза Эдуардаўна Рабіза марыць, што некалі СШ № 1 будзе нададзенае імя выдатнага земляка. А пад час майго тэлефанавання яна паведаміла, што нядаўна пачатая рэканструкцыя будынка школы. Паколькі ўсё робіцца не спыняючы заняткаў, то ўрокі ідуць у дзве змены. Ёсць жаданне Т.Э. Рабізы, каб пад музей П. Сухога быў выдзелены яшчэ хаця б адзін пакой (цяпер усе экспанаты ў адным кабінеце). Былі меркаванні забраць пад музей частку чырвонай школы, але пачулі адказ, што будынак у аварыйным стане. Безумоўна, трэба было мяняць перакрыцці, але сцены яшчэ моцныя, некалькі дзён не маглі разбурыць іх... У артыкуле «Навошта разбурылі "чырвоную школу"?» рэдактар газеты «Вольнае Глыбокае» піша: «Дыхтоўны будынак. Прастаяў ён паўтара стагоддзя, прастаяў бы яшчэ столькі, і больш. Дзясятак мемарыяльных шыльдаў можна было прымацаваць на сцены. Будучыя вядомыя навукоўцы, пісьменнікі, адміралы флота яе скончылі». Дадам, што мне вядомыя з дзясятак знакамітых асобаў, лёсам звязаных з гэтай школай. Думаю напісаць пра тое падрабязней. Тым больш, ёсць людзі, якія шмат расказалі мне пра мінуўшчыну Глыбоччыны, а камусьці з краязнаўцаў гэта можа падацца спазнаваўчым, іншым – як штуршок для росшукаў у сваім рэгіёне. А ўддалены рэгіён падобныя артыкулы прыцягваюць турыстаў.


*СШ № 1, дзе працуе музей П. Сухога*

*Генадзь КОМЕЛЬ, краязнаўца, экскурсавод*




*Кастрычнік 2010 года мне пашчасціла правесці на востраве Готланд (Швецыя). Там, у галоўным горадзе вострава Візбю, знаходзіцца Балтыйскі Цэнтр пісьменнікаў і перакладчыкаў (далей – Цэнтр). Гаспадыня (дырэктрыса) Цэнтра Лена Пастэрнак з бліжэйшым памочнікам Патрыкам і некалькімі супрацоўніцамі дзейнічаюць дбайна, амаль непрыкметна, а лепшых умоваў для творчасці дый адпачынку ў Цэнтры нам, часовым пастаяльцам з розных краінаў, цяжка было і жадаць.*

*І што ж гэта за край, куды ласкава і нечакана прывёў мяне лёс.*

## Божая зямля

Востраў Готланд (Gotland) азначае «Зямля готаў», бо менавіта готы, як сведчыць гісторыя, адны з першых асвоілі гэты немалы, у тры тысячы квадратных кіламетраў, кавалак сушы. Але тым, хто пабываў там, больш да душы была б назва вострава з дзвюма «t» (Gottland), што можна перакласці з нямецкай як «Божая зямля», бо столькі там прыгожых мясцінаў, столькі цікавага, прыемнага, людскага! Канечне, у кастрычніку і кветак меней, і фарбы крыху не тыя, чым летам. Сапраўды, дзе-нідзе пачынаюць ужо прабівацца плямы аранжавага і жоўтага адценняў. Ды зяляніны пакуль хапае. Ружы таксама ўпэўнена палымнеюць, цягнучыся іншым разам проста з-пад бруку да вакон утульных старажытных будыначкаў. А ў невялікім батанічным садзе Візбю яны яшчэ быццам і не думаюць пра восень. Тое ж – і ў нягустарасцяваных па тэрыторыі вострава дагледжаных сядзібах.

Праз пару дзён па прыбыцці мяне разам з чароўнай літоўскай перакладчыцай Юратэ ветліва запрасіла прагуляцца на ўласным аўто пісьменніца з Кракава Ева Рудольф. Мы пранесліся амаль сотню кіламетраў да самай паўднёвай кропкі Готланда, час ад часу збочваючы, каб агледзець тую ці іншую славутасць. Добрае ўражанне пакінула царква (kyrka, чытаецца па-шведску – чурка) звонку і знутры, з яе акуратным цвінтарам вакол, цікава было ў іншым месцы агледзець старажытнае (500 г. да н.э.) пахаванне ў выглядзе 20-метровага ў даўжыню контура ладдзі, выкладзенага з валуноў. Каля аднаго з кафэ, дзе перакусвалі, сустрэў скульптуру каменячоса, фотаздымак якой бачыў гадоў 30 таму ў нейкім часопісе. Уразіў таксама масіў гіганцкіх ветравых энергетычных установак, якія дзелавіта вымахвалі сваімі лопасцямі-крыламі... Кіравала машынай Ева адчайна, тармазіла нечакана, так што я часцяком стукаўся тварам аб спінку пярэдняга сядзення. Выклюнулася жартоўная рыфмаванка:

*Руль-стырно далікатніца*
*Ева*
*Круціць крута направа,*
*налева.*
*Тармазне –*
*і дубасішся мордаю,*
*Маеш гуз і паходку*
*няцвёрдую...*



*Балтыйскі Цэнтр пісьменнікаў і перакладчыкаў*



*Ладдзя, пахаванне старажытнага вікінга*

А праз пару дзён Ева, на жаль, ад'язджала. Далейшыя вандроўкі здзяйсняў я ўжо пешшу. Ды пешшу зручней хадзіць аднаму, у сваім тэмпе, а не кампаніяй...

## Марафонская дыстанцыя

...Звыш года таму я змушаны быў узяцца за хадзьбу і бег. Сёлета не толькі трэніраваўся, а й удзельнічаў у спаборніцтвах на працяглыя, марафонскія, адлегласці, займаў нават прызавыя месцы ў сваёй узроставай групе (каму за 70). З такімі «напрацоўкамі», вядома ж, цяжка было ўтрымацца, каб па прыездзе на месца не пусціцца ў паходы па наваколлі Візбю. Канечне, падагравала і звычайная цікаўнасць. Пратупаў на працягу 28 дзён сумарна звыш 300 км, адыходзячы на 10, 20, а то і больш кіламетраў ад горада. Умоўна – абышоў Готланд па перыметры. У вандроўках сустракаў процьму незнаёмага, нязвыклага, незвычайнага. Былі і нечаканыя выпадкі.

Ну вось такі, напрыклад...

Хадзіў я не толькі па глухіх, рамантычных сцежках, дзе трапляў часам у пераплёты, але й па дагледжанай шашы, балазе на аўтатрасах адлегласці пазначаныя. Двойчы без прыпынку прайшоў нават крыху болей ад класічнай марафонскай дыстанцыі (43 і 45 км). Спачатку на ўсход. За 20 км ад Візбю, углыб вострава, па мапе выявіў мястэчка з назваю Roma. Вельмі ж спакусліва пабываць у Рыме, калі ён не за тысячы кіламетраў, а нечакана зусім побач! Дайшоў, пабываў, пракрочыў і за межы гучнага населенага пункта з кіламетр-паўтара... Вяртаюся, падыходжу ўжо пры ліхтарах да Цэнтра, а там чамусьці сустракае з дальняга паходу небаракумарафонца дырэктрыса Лена Пастэрнак і... вачам сваім не веру – пасол Швецыі ў Беларусі Стэфан Эрыксан! Я аслупянеў, а спадар Стэфан кінуўся цісну мне радасна руку. Выявілася, што ён заходзіў у Цэнтр яшчэ ў полудзень, каб пабачыцца са мною, бо мы знаёмыя. Мабыць, яму было цікава даведацца, як пачуваецца грамадзянін і жыхар Беларусі ў яго краіне, у яго дзяржаве. А радаваўся ён, мабыць, і таму, што змог так мяне ашаломіць нечаканым сваім з'яўленнем. Вось гэта прыз за «марафонскі дэбют» у Швецыі, вось гэта гонар, вось гэта пашана адпетаму бадзягу!.. Так хацелася думаць. Хацелася думаць таксама тое, што ў гэтай краіне нават экспромтны знак павагі да яе адметна заахвочваецца. І насамрэч атрымалася: Надзвычайны і Паўнамоцны пасол Швецыі ў Рэспубліцы Беларусь прыляцеў у Візбю на нейкую сур'ёзную канферэнцыю ды адначасова неафіцыйна здзейсніў яшчэ адну добрую справу. Шкада, што ён вельмі спяшаўся, і выпала мала часу на гаворку. Аднак парадавацца фантастычнай сустрэчы, перакінуцца некалькімі беларускімі фразамі (на здзіўленне дырэктрысы) і парагатаць соладка мы паспелі...

Канечне, не можа не ўражваць тое, што пасол Швецыі здолеў «з нуля» (адзіны з паслоў!) па прыездзе ў Беларусь цудоўна авалодаць беларускай мовай і шырока й бліскуча карыстацца ёю ў жыцці і дыпламатычнай практыцы. Ён мог бы па праве ўзначаліць клуб падобных яму шанавальнікаў беларускай мовы, якія прыехалі ў Беларусь з іншых зямель і здолелі засвоіць чароўную мову краіны новага свайго пражывання. Чальцы такога клуба маглі б моцна ўплываць на працэсы вяртання карэннага насельніцтва да мовы сваіх продкаў, да роднага слова.

*Валеры СТРАЛКО,*
*фота аўтара*



*З Візбю – від на мора*

*(Працяг будзе)*

# Народныя пісьменнікі Беларусі Іван Шамякін і Іван Мележ

## Да 90-годдзя з дня іх нараджэння

**Уздоўж**

**5**. Пасёлак каля Масквы, дзе беларускі пісьменнік Іван Мележ у апошнія гады вайны, пасля лячэння ў шпіталі, выкладаў студэнтам эвакуяванага БДУ ваенную падрыхтоўку. **6**. Горад на Гомельшчыне, які 500 гадоў таму адным з першых беларускіх гарадоў атрымаў магдэбургскае права. **7**. Гераічны змест рамана І. Мележа «Мінскі напрамак». **12**. «Вячэрні ...». Кніга прозы народнага пісьменніка Беларусі, удзельніка Вялікай Айчыннай вайны, грамадскага дзеяча Івана Шамякіна. **13**. «Глыбокая ...». Раман І. Шамякіна пра партызанскі рух на Беларусі. **14**. Кніга гістарычных сцэн і аповесцяў, напісаная І. Шамякіным у 1990 г. **17**. «Непаўторная ...». Аповесць І. Шамякіна з пенталогіі «Трывожнае шчасце». **18**. Горад на Гомельшчыне, дзе імя І. Шамякіна носіць педагагічны ўніверсітэт. **19**. Кузьма .... Беларускі пісьменнік, які некалі высока ацаніў адно з ранніх апавяданняў І. Мележа «У завіруху». **20**. Доўгія вузкія сані ў народаў Поўначы. **21**. Пласт узаранай зямлі. **22**. «Петраград–...». Раман І. Шамякіна (1983). **25**. «Як жа вам чуецца ў свеце цяпер, // ... мае на палескім балоце?». З верша М. Мятліцкага «Пудка шапоча на ветры аер», прысвечанага памяці яго земляка І. Мележа. **29**. Горад на Гомельшчыне, дзе летась быў адкрыты помнік героям літаратурных твораў І. Мележа. **30**. Даслоўная вытрымка з тэксту, прамовы. **31**. Першая аповесць І. Шамякіна, была апублікаваная ў часопісе «Полымя» ў 1945 г.

**Упоперак**

**1**. «... над штыкамі». Кніга аповесцяў і апавяданняў І. Шамякіна (1976). **2**. Віктар .... Прозвішча беларускага кінарэжысёра, аднаго з аўтараў экранізацыі трылогіі І. Мележа «Палеская хроніка» (к/ф «Людзі на балоце»). **3**. Прасочванне растваральніка ў раствор скрозь тканкі (спец.). **4**. Вёска ў Добрушскім раёне, родны куток І. Шамякіна. **8**. Цыліндрычны скрутак з лістоў паперы. **9**. Электрычна зараджаная часціца. **10**. Пятро .... Прозвішча галоўнага героя пенталогіі І. Шамякіна «Трывожнае шчасце». **11**. «Атланты і ...». Раман І. Шамякіна, па матывах якога зняты фільм. **15**. Невялікі літаратурны твор, майстрам напісання якога быў І. Мележ. **16**. «Чырвоная ...». Рэспубліканская газета, у якой у 1939 г. быў надрукаваны верш І. Мележа «Радзіме». **21**. «... на далоні». Раман І. Шамякіна з галоўным героем доктарам Ярашам (1964). **23**. «Ідзі ў родны край, там і пад ёлкаю ...» (прык.). **24**. Агульная назва радыё, тэлебачання, газетаў, часопісаў і інш. (абрэв.). **26**. Свята беларусаў-католікаў, адзначаецца 1 лютага. «На святога ... зіма багата» (прык.). **27**. Старадаўняя назва рубіна, які, паводле павер'яў, прыносіць шчасце ў каханні. **28**. Курыца (ласк.).




*Склаў Лявон ЦЕЛЕШ,*
*г. Дзяржынск*

## У тэатры «Зьніч»

Рэпертуар апошняга зімовага месяца Беларускі паэтычны тэатр аднаго акцёра «Зьніч» пачынае ўдзень **9 лютага** спектаклем **«Вясёлая каруселя»** паводле твораў Артура Вольскага. Выканаўца – заслужаная артыстка Рэспублікі Беларусь Ларыса Горцава, музычнае суправаджэнне Дар'і Неўмяржыцкай (цымбалы). Дзеці разам з стваральнікамі спектакля яшчэ раз звернуцца да такіх вечных паняццяў, як сяброўства, узаемадапамога і павага.

**10 лютага** ўвечары Галіна Дзягілева запросіць на пастаноўку **«Пяюць начлежнікі»**, заснаваную на празаічных творах Змітрака Бядулі (рэжысёр-пастаноўшчык Таццяна Пацай).

На **14 лютага** запланаваныя дзве пастаноўкі. Удзень маленькія гледачы пабачаць лялечны монаспектакль **«Граф Глінскі-Папялінскі»** паводле казкі Артура Вольскага. Артыст Вячаслаў Шакаліда раскажа, як пасля разнастайных перыпетыяў хлапчук Марцінператварыўся ў загадкавага графа Глінскага-Папялінскага. Увечары Мікола Лявончык запросіць на пастаноўку **«Не праклінай, што я люблю»**, створаную паводле вершаванага рамана Ніла Гілевіча «Родныя дзеці». Твор гэты сучасны і вельмі актуальны. Ягоныя героі ставяць сабе, жыццю зусім няпростыя пытанні. На некаторыя з іх давядзецца адказваць усім нам, родным дзецям зямлі беларускай. Музычнае суправаджэнне Дар'і Неўмяржыцкай (цымбалы).

**16 лютага** ў тэатры зноў чакаюць маленькіх гледачоў – будзе паказаны лялечны монаспектакль **«Пра ката Сафрона і пеўніка Андрона»** Леаніда Мікіты. Артыст Леанід Сідарэвіч раскажа пра тое, як небараку-ката злая мачаха выгнала з дому, і як у жыцці яму дапамаглі сапраўдныя сябры.

*Спектаклі праходзяць у Тэатральнай зале культурнага цэнтра касцёла Св. Сымона і Св. Алены. Дзіцячыя пастаноўкі пачынаюцца а 15 гадзіне, вечаровыя – а 19-й. Дадатковую інфармацыю можна атрымаць па мінскім тэлефоне (017) 331-75-53.*


Не праклінай, што я люблю




Ігар Пракаповіч

# Назвы нашых вёсак

***(Працяг. Пачатак у №№ 30–35, 39–48 за 2010 г. №№ 1–4 за 2011 г.)***

**Свірплішкі** – вёска за 31 км на паўднёвы захад ад Паставаў, за 2 км на ўсход ад Лынтупаў. У пачатку XX стагоддзя ў Лынтупскай воласці Свянцянскага павета, флігель Бішэўскага. Назва, верагодна, мае фіна-балцкае паходжанне. Першапачатковай асновай стаў тэрмін *«syva»* – «глыбокі». Магчыма, ён быў перанесены з суседняй вёскі Свірдуні. Пазней да яго далучылася балцкае *«plešines»* – «высечанае месца ў лесе, разараная ніва». Такім чынам, вёска ўзнікла на «глыбокай плешыне сярод лесу». Цікава, што сучаснае месцазнаходжанне паселішча пацвярджае тлумачэнне назвы: яно ляжыць на невялікім лапіку «голай» зямлі сярод спрадвечнага і даволі вялікага ляснога масіву.

**Сенькішкі** – вёска за 31 км на паўднёвы захад ад Паставаў, за 8 км на паўднёвы усход ад Лынтупаў. У 1873 годзе была ў складзе Лынтупскай воласці Свянцянскага павета Віленскай губерні, уладанне Бішэўскага. Назва паходзіць ад кананічнага праваслаўнага імя *Сямён (Сімеон)*, якое ўтварае шмат формаў, у тым ліку *Сеня, Сенька, Сенік*. У Пастаўскім раёне сустракаюцца прозвішчы Сянько, Сенькавец, Сенюковіч.

**Сергі** – вёска за 30 км на паўднёвы ўсход ад Паставаў, за 16 км на поўдзень ад Варапаева. У пачатку XX стагоддзя была ў складзе Дунілавіцкай воласці Вілейскага павета Віленскай губерні. Назва паходзіць ад кананічнага праваслаўнага імя *Сергій*, што азначае «высокі», «шаноўны». Яно ўтварае шмат формаў, у тым ліку і *Серга, Сярго, Сяргуля, Сяргуша*. У Пастаўскім раёне сустракаюцца прозвішчы, утвораныя ад імя Сяргей: Сяргееў, Сяргеенкаў, Сяргейчык, Сяргіенкаў.

**Сіманы** – вёска за 15 км на паўднёвы ўсход ад Паставаў, за 13 км на паўднёвы захад ад Варапаева. У 1873 годзе была ў Манькавіцкай воласці Вілейскага павета Віленскай губерні, уладанне Тызенгаўза. Назва паходзіць ад яўрэйскага імя *Сімон (Сымон, Шымон)*, што азначае «паслухмяны». У Пастаўскім раёне сустракаюцца прозвішчы Сіманёнак, Сімановіч, Сымановіч, Сіманька, Сіманайць, Сіманчук.

**Сіманькі** – вёска ў Шыркаўскім сельсавеце. У пачатку XX стагоддзя была ў Манькавіцкай воласці Вілейскага павета Віленскай губерні. Паходжанне назвы гл. *Сіманы*.

**Сіўцы** – вёска за 5 км на поўнач ад Паставаў на паўночным беразе возера Белае. У 1873 годзе была ў Пастаўскай воласці Віленскай губерні. У аснове назвы ляжыць адметнасць колеру: *«сівы»* – «чалавек з белымі валасамі, або з валасамі, якія страцілі сваю афарбоўку». Верагодна, гэтай асаблівасцю вызначаліся жыхары вёскі. У Пастаўскім раёне сустракаюцца прозвішчы Сіваш, Сівіцкі, Сіўко, Сіўчак.

**Скарпаўцы** – вёска за 23 км на паўднёвы захад ад Паставаў, за 8 км на паўднёвы захад ад Камаяў. У пачатку XX стагоддзя была ў Камайскай воласці Свянцянскага павета Віленскай губерні. Назва паходзіць ад старажытнаславянскага тэрміна *«скарпа»* – «стромкая вяршыня гары», «круты схіл». Геаграфія пацвярджае такое тлумачэнне, бо сапраўды, у ваколіцах вёскі рэльеф вельмі складаны, узгорысты, са стромкімі схіламі.

**Скварцова** – вёска за 16 км на ўсход ад Паставаў, за 8 км на паўднёвы захад ад Варапаева каля вёскі Лучай. Назва ўтвораная ад прозвішча першапасяленца *Скварцова*. Пасля бунту мясцовых жыхароў, якія адбыўся ў Лучаі ў 1905 годзе і ў час якога была разбураная пратэстанцкая кірха, уладальнік тутэйшых зямель барон Клейгельс перасяліў сюды сялянаў з Расіі. Верагодна, тады і патрапілі на Пастаўшчыну Скварцовы. Прозвішча гэтае сустракаецца і зараз.

***(Працяг на стар. 8)***

(Працяг. Пачатак на стар. 7)

**Скварцова** – вёска за 16 км на ўсход ад Паставаў, за 8 км на паўднёвы захад ад Варапаева каля вёскі Лучай. Назва ўтвораная ад прозвішча першапасяленца *Скварцова*. Пасля бунту мясцовых жыхароў, які адбыўся ў Лучаі ў 1905 годзе і ў час якога была разбураная пратэстанцкая кірха, уладальнік тутэйшых зямель барон Клейгельс перасяліў сюды сялянаў з Расіі. Верагодна, тады і патрапілі на Пастаўшчыну Скварцовы. Прозвішча гэтае сустракаецца і зараз.

**Скрунды** – вёска за 26 км на паўднёвы захад ад Паставаў, за 9 км на паўднёвы ўсход ад Лынтупаў на заходнім беразе возера Саранчаны. У пачатку XX стагоддзя была ў Камайскай валасці Свянцянскага павета Віленскай губерні. Верагодна, назва ўтвораная ад асновы *«кру-»*, якая сустракаецца ў славянскіх і балцкіх мовах у значэнні *«круча, крутьы»*; у літоўскай мове – *«krucis»*. Геаграфічна вёска знаходзіцца ў даліне ручая, абапал якога падымаюцца крутыя схілы. Нельга выключаць і паходжанне назвы ад балцкага прозвішча *Скрунда*, што ад *«skrundele»* – «мурашка».

**Скураты** – вёска за 12 км на поўдзень ад Паставаў, за 2 км на поўнач ад Вярэнек. Назва адлюстроўвае занятак жыхароў. Яны абраблялі *скуры* жывёлаў, адкуль і пайшла мянушка-прозвішча. У Пастаўскім раёне сустракаюцца прозвішчы Скурат, Скурка, Скур'ят, Скурацёнак.

**Слабада** – вёска за 13 км на паўночны ўсход ад Паставаў, за 2,5 км на поўнач ад Навасёлак. У пачатку XX стагоддзя была ў Лучайскай валасці Вілейскага павета Віленскай губерні. У 1905 годзе засценак барона Клейгельса. Назва вёскі адлюстроўвае асаблівасці даўнейшых эканамічных адносінаў: *слабада* – гэта паселішча, жыхары якога на пэўны тэрмін вызваляліся ад падаткаў.

**Сліжова** – вёска за 13 км на паўднёвы ўсход ад Паставаў, за 2 км на захад ад Груздава. У 1873 годзе была ў Манькавіцкай валасці Вілейскага павета Віленскай губерні, належала Хомскім і Козелам. У 1905 годзе – вёска і засценак Палякевіча. Паходжанне назвы можна звязаць з дыялектным словам *«слезня»* – «крыніца на балоцістым лузе». Пастаянны выхад вады на паверхню робіць глебы вільготнымі, слізкімі, што, магчыма, і дало штуршок для ўтварэння гэтай назвы. Паходжанне назвы вёскі можна звязаць і з прозвішчам *Сліж*, якое ўтварылася ад наймення невялікай рыбы галец.

**Смычча** – вёска за 17 км на паўднёвы ўсход ад Паставаў, за 2 км на ўсход ад Груздава абапал ракі Аржоўкі. У 1905 годзе фальварак Пшаздзецкіх Смыч знаходзіўся ў Манькавіцкай валасці Вілейскага павета Віленскай губерні. Таксама былі аднайменныя старожка і выселак. Назва паходзіць ад старажытнага славянскага дзеяслова *«смыкацца»* – «рабіць сутаргавыя рухі». Гэтае слова, напэўна, характарызуе адметнасць ракі Аржоўкі, якая мела непастаянную плынь, звілістае рэчышча. Цікава, што недалёка ад вёскі, на ўсходняй ускраіне лясной Груздаўскай Дачы, цячэ рака Смычыца, назва якой пацвярджае найменне паселішча.

**Соўкі** – вёска за 6 км на ўсход ад Паставаў. У пачатку XX стагоддзя была ў Пастаўскай валасці Дзісненскага павета Віленскай губерні. Назва паходзіць ад прозвішча *Соўка*, якое ўтварылася ад імя або мянушкі. Найбольш верагодным падаецца яго ўтварэнне ад дыялектнага дзеяслова *«соўкаць»* – «песціць, апекавацца, нянькацца». Адсюль і *«соўка»* – «пястун, распешчаны». Магчымы варыянт паходжання назвы ад імёнаў *Сава і Вячаслаў*, якія сустракаюцца ў формах Саўка, Саўко. Сустракаецца і версія паходжання ад назвы птушкі *«соўка»*, якая адносіцца да сямейства сапраўдных соваў. У Пастаўскім раёне распаўсюджаныя прозвішчы Соўка, Саўкоў.

**Споры Вялікія** – вёска за 10 км ад Паставаў. Вядомая з 1557 года як маёнтак Фурсаў. Назва паходзіць ад возера *Споры*. Падобнае найменне мае і рэчка Спарыца, якая злучае азёры – і з возера Споры цячэ ў возера Задзеўскае. Калі палічыць, што засяленне гэтай мясцовасці ішло па рацэ, то і назва ракі павінна быць першаасновай. Прыдатнае тлумачэнне даюць славянскія мовы. *«Спорная вада»* – гэта месца, дзе сыходзяцца дзве плыні, «сшибка встречных потоков» (У. Даль). Сапраўды, недалёка ад возера Задзеўскага ў Спарыцу ўпадала рака Глодаўка. На месцы сутокаў існавала невялікае возера, якое зараз ператварылася ў балота. У гэтым возеры і маглі актыўна праяўляцца буруны, вадавароты, інакш кажучы, спорная вада. Нельга выключыць і паходжанне назвы з фіна-вугорскіх моваў, дзе *«сора»* мае сэнсавыя значэнні «рэчышча ракі», «сутокі рэк», «невялікая рэчка».

(Працяг будзе)

## Люты

**12 – Дрынеўскі Міхаіл Паўлавіч (1941)**, харавы дырыжор, мастацкі кіраўнік Нацыянальнага акадэмічнага народнага хору Рэспублікі Беларусь імя Г.І. Цітовіча, народны артыст Беларусі, заслужаны дзеяч мастацтваў Беларусі, лаўрэат Дзяржаўнай прэміі Беларусі (1982), прэміі «За духоўнае адраджэнне» (1997), прэміі Федэрацыі прафсаюзаў Беларусі (2001) – 70 гадоў з дня нараджэння.

**14 – Улашчык Мікалай Мікалаевіч** (Дзяржынскі р-н, 1906 – 1986), беларускі гісторык, археограф, археолаг, этнограф, краязнавец, літаратар – 105 гадоў з дня нараджэння.

**14 – Цвяткоў Юрый Мікалаевіч (1941–2011)**, кінарэжысёр, заслужаны дзеяч мастацтваў Беларусі, лаўрэат Дзяржаўнай прэміі Беларусі (1986), уладальнік прызоў і дыпломаў многіх міжнародных фестываляў – 70 гадоў з дня нараджэння.

**15 – Паплаўскі Георгій Георгіевіч** (1931), графік, жывапісец, народны мастак Беларусі, заслужаны дзеяч мастацтваў Беларусі, акадэмік НАН Беларусі і Расійскай Акадэміі мастацтваў, лаўрэат прэміі Ленінскага камсамола Беларусі (1970), Міжнароднай прэміі імя Дж. Неру (1974), Дзяржаўнай прэміі Беларусі (2002) – 80 гадоў з дня нараджэння.

**19 – Сялянская рэформа 1861 г.**, буржуазная рэформа, якая скасавала прыгоннае права і паклала пачатак капіталістычнай фармацыі ў Расійскай Імперыі, у т.л. на Беларусі – 150 гадоў з пачатку правядзення.

## З пошты «КГ»

Паважаная рэдакцыя!

У № 1/2011 «Краязнаўчай газеты», у рубрыцы «Малая краязнаўчая энцыклапедыя», даюцца толькі тры значэнні слова «лава» – як прадмет мэблі, плыт ці частка плыта. Але ж на тэрыторыі сучаснага Асіповіцкага раёна былі ў абарачэнні і іншыя значэнні гэтага слова. Так, у кнізе І. Сербава «Беларусы-сакуны» чытаем: «Усе вёскі ў сакуноў маюць толькі адну вуліцу, праезная частка вуліцы замошчаная бярвеннем і называецца "лавай"».

Таксама «лавай» называліся кладкі праз ручай ці балота. Трэба думаць, што слова «лава» ў такім значэнні ўжывалася здаўна, бо вядомы інвентар Свіслацкай воласці 1560 года называе «Лаву тёсаную» на рэчцы Талі, на мяжы ваколіцаў вёсак Цэль і Арэшкавічы.

Гэты ж сэнс слова «лава» – «кладкі, масткі праз ручай, рэчку ці балота» выводзіць да латышскага слова «лайпу» – «дошкі ці масткі, перакінутыя праз роў ці ручай».

***Юрый КЛЕВАНЕЦ,***
***г. Асіповічы***

# Малая краязнаўчая энцыклапедыя

***Пачатак у № 1 за 2003 год)***

**ЛАПУ́Н** – печыва з квашанага цеста ў выглядзе тоўстага бліна. Камяк цеста падсольвалі, расплясквалі на патэльні, пасыпалі кменам, макам. Пяклі пры агні, на гарачым вуголлі. Спажывалі за снеданнем, бралі ў поле, на сенажаць. Часам намазвалі слоем тварагу, здорам, смятанай, цёртым макам. Такі лапун пасылалі сваякам як гасцінец, бралі з сабою ў адведкі да парадзіхі. Вядомы пераважна на Віцебшчыне. Падобны да скавародніка, праснака.

**ЛА́ПЦІ** – традыцыйны сялянскі абутак, плецены з лыка (лазовага, ліпавага), пяньковых або льняных вітушак ці тонкіх вяровачак. Лыка дралі ў маі-чэрвені; нарыхтоўвалі таксама луцце – тонкія ліпавыя пабегі з карой. Лыкавыя скруткі вешалі ў клеці, на гарышчы; перад выкарыстаннем іх размочвалі ў цёплай вадзе (каб былі эластычнымі), луцце распарвалі ў печы і здымалі з яго лыка.

У залежнасці ад тэхнікі вырабу вылучаліся 2 тыпы: прамога (пашыраны паўсюдна) і касога (ва ўсходняй Беларусі) пляцення.

Лапці прамога пляцення падзяляліся на некалькі відаў. Найбольш пашыранымі былі кавярзні (глухія лапці, слепакі) – з глыбокім закрытым наском (галоўкай) і запяткам. На Віцебшчыне, часткова Магілёўшчыне плялі шчарбакі (бяспятнікі) — неглыбокія (амаль адна падэшва) лапці без галовак (замест іх спераду былі дзве шырокія лыкавыя пятлі) і запятак, з кожнага боку – пара вузкіх петляў (заборнікі) для прадзявання абораў. Шчарбакі насілі пераважна ўлетку на працы ў полі. На Палессі, поўдні Гродзенскай і Мінскай губерняў бытавалі т.зв. зрачыя лапці, у якіх насок пасярэдзіне зверху быў адкрыты – «вока» (яго стварала адсутнасць пярэдняга вушка – стракі). Лапці прамога пляцення пачыналі плесці з наска (толькі шчарбакі з пяты). У бакавыя вушкі (курцы, куракі) устаўляліся завостраныя з аднаго канца палачкі (сугакі, занозы), падэшву для моцнасці падплятталі лыкам з дапамогай жалезнага ці касцянога кручка (спіца, спічук, качадык, падплётка). Зрэдку ніз падшывалі скурай. На Падняпроўі і Паазер'і бытавалі лапці прамога пляцення з пяньковай вяроўкі.

Лапці касога пляцення – пахлапні (пахрасні) – былі пашыраныя на беларуска-рускім памежжы і лічацца рускім запазычаннем. Мелі глыбокія круглыя насы, высокія бакі і запяткі. Пры іх вырабе вузкія, ачышчаныя ад кары палоскі лыка шчыльна падганялі адна да другой; плялі на драўлянай калодцы пад памер нагі. Падэшву падплляталі вітушкамі пянькі ці тонкімі вяровачкамі. Пахлапні часам рамеснікі выраблялі на заказ ці на продаж. Яны лічыліся святочным абуткам, насілі іх па некалькі гадоў. У XIX ст. на захадзе Беларусі былі пашыраныя пасталы – скураныя лапці.

Выраб лапцей быў пераважна мужчынскім заняткам (іх плялі ў вольны ад працы час, зімовымі вечарамі і пад.). Іх насілі мужчыны і жанчыны, дарослыя і дзеці цягам года. Надзявалі на палатняныя анучы, зімою – на суконкі. Дробная шляхта замест анучаў скарыстоўвала шарсцяныя панчохі.




*Лапці: 1 – шчарбакі; 2 –зрачыя; 3 – пахлапні; 4 – кавярзні*

Газета зарэгістравана ў Міністэрстве інфармацыі Рэспублікі Беларусь. Рэгістрацыйнае пасведчанне № 384 ад 15 мая 2009 г.
Заснавальнікі: грамадскае аб'яднанне «Беларускі фонд культуры», вытворчае прыватнае унітарнае прадпрыемства «Светач», Гілеп Уладзімір Аляксандравіч.

Краязнаўчая газета

Індэкс індывідуальнай падпіскі – 63320
ведамаснай – 633202

Галоўны рэдактар – Уладзімір ГІЛЕП.
Намеснік галоўнага рэдактара Уладзімір Пучынскі.
Рэдкалегія: Анатоль Бутэвіч, Андрэй Вірчак, Анатоль Грыцкевіч, Алесь Карлюкевіч, Лідзія Кулажанка, Адам Мальдзіс, Вячаслаў Рагойша, Віталь Скалабан, Віктар Хурсік.

Наш адрас:
220029, г. Мінск,
вул. Камунальная набярэжная, 6.
Тэл. 283 28 26,
334 61 62.
Тэл./факс 334-42-03
E-mail: kraga@tut.by

З-за абмежаванасці сродкаў выданне безганарарнае.
Аўтарскія рукапісы не рэцэнзуюцца і не вяртаюцца.
Аўтары допісаў у рэдакцыю паведамляюць сваё прозвішча, імя і імя па бацьку, асноўнае месца працы, зваротны адрас.
Меркаванні аўтараў могуць не адпавядаць пункту гледжання рэдакцыі.
Аўтары нясуць адказнасць за дакладнасць матэрыялаў.
Пры передруку спасылка на «Краязнаўчую газету» абавязковая.

Падпісана да друку: 04.02.2011.
Газета надрукавана ў друкарні ТДА «Знамение» (Мінск, вул. Каржанеўскага, 14).
Ліцэнзія ЛП № 02330/0150475 ад 25.02.2009.
Заказ 121.
Тыраж 1180 асобнікаў.